# «ХТОСЬЦІ ВАЮЕ, ХТОСЬЦІ НАЖЫВАЕЦЦА... А НАМ ТРЭБА ЛЮДЗЕЙ НАКАРМІЦЬ»

**Развіццё жывёлагадоўлі, праблемы і ключавыя задачы галіны разгледзелі на самым высокім узроўні**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЧЭРВЕНЯ 2025 г. СЕРАДА № 116 (30504)

# «ЛІЧБА» У ДАПАМОГУ

## Што цікавага на выстаўцы Digital Expo — 2025

Міжнародная выстаўка Digital Expo — 2025 праходзіць з 17 да 20 чэрвеня ў Мінску. Гэта ўнікальная пляцоўка абмену вопытам, якая аб'ядноўвае прафесіяналаў лічбавай індустрыі. Сёлета ў выстаўцы бяруць удзел больш за 90 кампаній і арганізацый, сярод якіх лідары ІТ-рынку Беларусі, Расіі і Кітая. Так, на працягу чатырох дзён пройдзе больш за 20 мерапрыемстваў, на якіх эксперты абмяркуюць актуальныя выклікі лічбавай эпохі ад дыгіталізацыі ў прамысловасці да тэхналогій і рашэнняў для развіцця разумных гарадоў.

СТАР. 5




Фота Лізаветы ГОЛАД.



МЕМАРЫЯЛ НАРОДНАЙ ПАМЯЦІ



ГУМАННАЕ ПАЛЯВАННЕ

14–15

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

НАПЯРЭДАДНІ

# ДАКРАНУЦЦА ДА ГІСТОРЫІ НА САЮЗНЫМ МАРШРУЦЕ

**Больш за 40 беларускіх школьнікаў возьмуць удзел у «Цягніку Памяці»**

22 чэрвеня, у Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, у Брэсцкай крэпасці традыцыйна стартуе культурна-адукацыйная патрыятычная акцыя «Цягнік Памяці». Каля 200 хлопцаў і дзяўчат, у тым ліку чатыры дзясяткі школьнікаў з нашай краіны, наведаюць 15 гарадоў Беларусі і Расіі. Завершыцца падарожжа 5 ліпеня ў Маскве. Сёлета праект прымеркаваны да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне,таму ў склад пасажыраў увойдуць нашчадкі пераможцаў — прадстаўнікі народаў усіх 15 рэспублік былога СССР, якія разам змагаліся супраць гітлераўскай Германіі. Ва ўсіх гарадах гістарычнага маршруту для школьнікаў падрыхтавана насычаная праграма — гэта як мерапрыемствы патрыятычнай накіраванасці, так і культурна-забаўляльныя акцыі і экскурсіі.

СТАР. 5



Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2025 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 — 763X

# «ХТОСЬЦІ ВАЮЕ, ХТОСЬЦІ НАЖЫВАЕЦЦА...

## Развіццё жывёлагадоўлі, праблемы і ключавыя задачы галіны

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сабраў адпаведны семінар-нараду. Тэму абмяркоўвалі не ў кабінетах, а непасрэдна на базе аднаго з малочнатаварных комплексаў філіяла «Астрашыцкі Гарадок» ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі». Сярод удзельнікаў семінара нарады — старшыні аблвыканкамаў і іх першыя намеснікі, упаўнаважаныя прадстаўнікі кіраўніка дзяржавы ў рэгіёнах, памочнікі Прэзідэнта — інспектары па абласцях. Фармат не новы. У лютым гэтага года падобны семінар-нарада з удзелам Прэзідэнта праходзіў на базе сельгаспрадпрыемства «Шыпяны-АСК». Тады галоўнай тэмай стала ўтрыманне буйной рагатай жывёлы ў зімова-стойлавы перыяд і іншае.

### КАРОВЕ ВАРТА ПАСТАВІЦЬ ПОМНІК

Гэтым разам пытанні былі больш глабальныя — аб развіцці жывёлагадоўлі ў цэлым. Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб сваёй прапанове паставіць помнік карове як прызнанне заслуг гэтай жывёлы, асабліва ў цяжкі ваенны час. «Людзі сыходзілі ў лясы і з сабой бралі скаціну, каб выжыць. Карова і сёння корміць народ. Гэта не толькі малако, але і мяса. Калі мы хочам быць здаровымі, трэба дыхаць нармальным паветрам і харчавацца нармальнымі прадуктамі. Выходзячы з гэтага, карова, вобразна кажучы, павінна стаяць у палацы», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён таксама нагадаў, што ў краіне ўжо вызначаны курс развіцця жывёлагадоўлі: старыя фермы неабходна пераўтварыць у жывёлагадоўчыя малочнатаварныя комплексы, дзе будуць выконвацца ўсе тэхналогіі ўтрымання буйной рагатай жывёлы і дзе будуць створаны ўсе неабходныя ўмовы. Размова важная і неабходная — і напярэдадні дзвюх нарад, анансаваных кіраўніком дзяржавы, — па захаванасці маладняку буйной рагатай жывёлы і па рабоце аграрна-прамысловага комплексу Віцебскай вобласці.

### «ЁСЦЬ УСЁ, КАБ АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАЦЭС ВЫТВОРЧАСЦІ І ПЕРАПРАЦОЎКІ»

Месца правядзення семінара, дарэчы, было выбрана невыпадкова. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што папрасіў былога губернатара Мінскай вобласці, а цяпер Прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына і іншых спецыялістаў вызначыць комплекс, з якога можна ўзяць прыклад. Выбралі МТК «Селішча-2» у агракамбінаце «Дзяржынскі». Тут усё выканана сучасна і якасна, але яшчэ і па-гаспадарску, эканомна. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што такі вопыт перадавых гаспадарак варта пераймаць усім. «Патрэбна сучаснае ўтрыманне жывёлы. І прадаваць малако сортам «экстра». Гэта сёння добрыя грошы, і сёння малако прыбытковае», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што нажывацца на войнах і канфліктах, якіх сёння шмат у свеце, — не беларускі варыянт, але разам з тым людзей трэба накарміць. А значыць, попыт на прадукты харчавання і адзенне (а адзенне таксама з зямлі) будзе толькі ўзрастаць. «Таму нам абавязкова трэба ісці гэтым шляхам, трэба ствараць малочнатаварныя комплексы, дзе мы будзем утрымліваць жывёлу», — ставіць задачу Прэзідэнт. Паводле яго слоў, сёння вырабляць малако высокай якасці — вельмі прыбытковая, бо з яго таксама можна ствараць прадукцыю, запатрабаваную на знешнім і ўнутраным рынках.

> **«У вас сёння ёсць усё, каб арганізаваць працэс вытворчасці і перапрацоўкі. Жарты ў бок. Паўтараю, яшчэ раз: не хочаце ў акопах сядзець, у гразі вошай пладзіць — давайце працаваць. Захаванне тэхналогій і ваенная дысцыпліна. Вам дадзены ўсе правы. Калі не хочам вайны, значыць, трэба працаваць правільна.**

Трэба атрымліваць прадукцыю і прадаваць. Трэба, каб сумленна падыходзілі да гэтай работы», — настроіў адказных за жывёлагадоўлю кіраўнік дзяржавы. І нагадаў пра дысцыпліну на працоўным месцы. Тым больш што, як падкрэсліў Прэзідэнт, мы ўмеем вырабляць якасныя прадукты харчавання, значыць, трэба гэта рабіць.

### «ЦІСК АДНОСНА ГЭТАГА БУДЗЕ СУР'ЁЗНЫ»

Кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на ўмовах утрымання буйной рагатай жывёлы, асабліва маладняку. Пры добрых умовах утрымання жывёлы памяншаецца падзеж, які для многіх гаспадарак з'яўляецца вялікай праблемай. А няма маладняку — няма малака і мяса.

«Ціск адносна гэтага будзе сур'ёзны. У нас ужо практыка з'явілася: Прэзідэнт задачу паставіў — ну і што, калі мы яе не выканаем за год-паўтара. Так больш не будзе», — папярэдзіў беларускі лідар. Акрамя камфортных умоў, патрэбныя яшчэ і якасныя кармы. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб даручэнні вырабіць айчынныя прэсы для нарыхтоўкі сенажу. І заадно даў даручэнне Камітэту дзяржкантролю — праехаць па краіне і паглядзець, як ідзе корманарыхтоўка. Асабліва гэта важна цяпер, калі ідуць ліўні і трэба своечасова пакаваць кармы ў плёнку. Няякасны корм — не сянаж, а «гнілаж» — небяспечны для здароўя каровы і цяляці. «Прэс трэба зрабіць. Гэта пытанне жыцця і смерці», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы.

Таксама Прэзідэнт нагадаў аб сваім даручэнні вырабіць робаты для даення, якія б па якасці былі не горшыя за імпартныя. Паводле яго слоў, у гэтым ёсць вялікая перспектыва, паколькі работнікаў на вёсцы становіцца менш.

### НЕ АДРЫВАЦЦА АД ЗЯМЛІ

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ўсе напрацоўкі і дасягненні ў сельскай гаспадарцы трэба захаваць для маладога пакалення, якое не так, як старэйшае, гатовае працаваць на зямлі. А між тым далучэнне моладзі вырашыла б многія праблемы. У прыклад Прэзідэнт прывёў скаргі на дэфіцыт бульбы. Ён параіў высаджваць хоць трохі бульбы на сваіх прысядзібных участках, у каго яны ёсць. І тады недахоп бульбы ў крамах не будзе такой вялікай праблемай. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што інтэнсіўныя тэхналогіі і індустрыялізацыя — гэта правільна і добра. Але галоўнае не адрывацца ад зямлі хоць бы ў сябе на ўчастку. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў намесніка кіраўніка спраў Прэзідэнта Мікалая Шарснёва, ці садзіць ён на дачы бульбу. «Штогод саджу», — адказаў той.

«Вось, у яго ёсць бульба, без праблем. Высокага ўзроўню чыноўнік. А звычайнаму чалавеку, у якога дзеткі маленькія... Мне бульба не трэба. Я яе знайду паўтара мяшка. Але ў мяне два ўчасткі. Хочаце паглядзець — калі ласка, хоць цяпер. Учора я паглядзеў і адзін, і другі ўчастак, бульбачка — залюбуешся. Акадэмія навук перадала насенне, я правяраю, што гэта за насенне. Усіх забяспечу бульбай, хто стаіць тут, дакладна», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён параіў заняцца працай на зямлі замест таго, каб ныць, што чагосьці не хапае.

> **«Я разважаю, можа быць, як рэтраград і кансерватар нейкі. Але жыццё нічога не прыдумала іншага: для таго, каб нешта мець, трэба гарбаціцца», — адзначыў Прэзідэнт.**

Кіраўніку дзяржавы і ўдзельнікам семінара далажылі аб вытворчай дзейнасці ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі» і перадавым вопыце будаўніцтва малочна-таварных комплексаў на прыкладзе МТК «Селішча-2». Удзельнікі мерапрыемства азнаёміліся з умовамі ўтрымання малочнай жывёлы на МТК, тэхналогіяй яе кармлення і даення, сучаснымі спосабамі ўнясення вадкіх арганічных угнаенняў. Прэзідэнт высока ацаніў убачанае. «Гэта будучае сёгоддзе» — адзначыў ён і звярнуў увагу, што супрацоўнікі гаспадаркі даведаліся аб прыездзе Прэзідэнта напярэдадні вечарам, гэта значыць, навесці глянец у іх не было часу. Атрымліваецца, тут заўсёды парадак, як і павінна быць.

### СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У НАС ШМАТ, ПАКУЛЬ КУЛЬГАЕ АРГАНІЗАЦЫЯ

Аляксандр Лукашэнка патлумачыў, чаму так часта нагадвае пра важнасць выканальніцкай дысцыпліны. «Паверце, нутром адчуваю: кінем працаваць — будзем ваяваць», — адзначыў ён. І прывёў да прыкладу Украіну, дзе ўсё пачыналася з таго, што краіну «расцягнулі», і сацыяльная несправядлівасць, якая ўзнікла на гэтай глебе, прывяла да вайны. Беларускі лідар зрабіў акцэнт на тым, што яго словы пра дысцыпліну — не палітычная прапаганда і агітацыя. «Я хачу, каб вы, кіраўнікі перш за ўсё, пранікліся гэтым. Як працаваць, мы ведаем», — адзначыў ён.

Прэзідэнт нагадаў, што на яго ўзроўні разгледзелі ўсе сельскагаспадарчыя культуры, ацанілі вартасці і недахопы кожнай, выпрацавалі стратэгіі па іх вырошчванні. Цяпер надышла чарга жывёлагадоўлі.

> **«Я вясковы чалавек, які пражыў нямала. І ведаю, што без прадуктаў харчавання, без адзення,**





# А НАМ ТРЭБА ЛЮДЗЕЙ НАКАРМІЦЬ»

## разгледзелі на самым высокім узроўні



**самага неабходнага чалавек жыць не можа. А насельніцтва планеты ўвесь час расце. Мы ўмеем гэта рабіць. Давайце будзем развівацца.**

Мы — машынабудаўнічая краіна. У нас дастаткова школ створана па машынабудаванні, іншых кірунках — хіміі, нафтахіміі, нафтаперапрацоўцы. У нас шмат галін там, дзе мы ўмеем працаваць. Туды трэба інвеставаць і ствараць дадаткова новыя прадпрыемствы. Рабіць тое, што мы ўмеем», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што гэта мерапрыемства важнае і для губернатараў, сярод якіх ужо палова — не аграрыі. Ён падкрэсліў, што яны прайшлі праз цэнтр, займалі высокія пасады, у сілавых структурах, прамысловасці, энергетыкі. І, нягледзячы на іх падрыхтоўку, ёсць і праблемы. «Спецыялістаў у нас шмат, пакуль культурае арганізацыя. Паглядзім, што з гэтага кадравага эксперымента атрымаецца. Але не хапае дысцыпліны. Усё робім правільна. Але часам робім павольна, а часам не робім наогул. Выканальніцкая дысцыпліна — пытанне нумар адзін», — падкрэсліў беларускі лідар. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у сельскай гаспадарцы цяпер бардак. І не таму, што не хапае людзей, а таму што іх не арганізавалі і не прымусілі працаваць. Прэзідэнт адзначыў, што запрасіў кіраўнікоў мясцовых органаў улады на гэты семінар-нараду, таму што бачыць прыстойны аб'ём невыканання.

**«Я вырашыў паступіць па-ваеннаму. У нас была ў арміі такая добрая формула: «рабі, як я». Вось я вырашыў вам паказаць: я ад вас патрабую вось гэта, зрабіце так. Тады не будзе падзяжу жывёлы. Таму што, калі будзе падзеж жывёлы, як цяпер ці ўчора, будзе гэта ўсё працягвацца, мы прыйдзем да таго, што нам есці самім не будзе чаго. Таму не думайце, што гэта капрыз Лукашэнкі», — патлумачыў свой падыход кіраўнік дзяржавы.**

Ключавыя пытанні развіцця жывёлагадоўлі разглядалі на канкрэтных прыкладах са спецыялістамі.

### ЧАМУ ТРЭБА БРАЦЬ ПРЫКЛАД З «ДЗЯРЖЫНСКАГА»

Генеральны дырэктар агракамбіната «Дзяржынскі» Уладзімір Лук'янаў падзяліўся перадавым вопытам свайго прадпрыемства. Перш за ўсё, варта адзначыць, што работа ў «Дзяржынскім» будуецца па поўным замкнёным цыкле — ад поля і фермы да перапрацоўкі і продажу, у тым ліку праз больш чым сотню фірменных магазінаў. Дарэчы, гаспадарка размешчана на тэрыторыі васьмі раёнаў Мінскай вобласці. «Па зямельных угоддзях гэта больш, чым раён. Па вытворчасці збожжа гэта тры савецкія раёны», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён пацікавіўся, ці няма крыўд на цэнаўтварэнне. Дырэктар агракамбіната запэўніў, што ніякіх.

**Прэзідэнт адзначыў, што вопыт «Дзяржынскага» трэба ўзяць на заметку адказным за пытанні цэнаўтварэння. Паводле яго слоў, вопыт агракамбіната трэба тыражаваць па ўсёй краіне.**

Агракамбінат пастаянна развівае новыя кірункі. У планах — развіццё адкорму бычкоў на мяса, гэта значыць, вытворчасць высакаякаснай ялавічыны з экспартным патэнцыялам. Вытворчасць будзе адкрыта ў Слуцкім раёне. І ад гэтага выйграе і Слуцкі мясакамбінат (які далучыцца да агракамбіната «Дзяржынскі»), бо яго магутнасці будуць загружаныя. «Мы хочам правесці такі эксперымент па адкорме на 8-9 тысяч галоў у год. Адпрацаваць там механізмы, падыходы, сумесна з навукай прапрацаваць рацыёны. Распрацаваць тэхналогію, рэгламент вырошчвання, утрымання, кармлення і будаўніцтва гэтага комплексу і паднесці гэта як гатовы прадукт для ўсіх. Мы ўжо выбралі ўчастак, тэхналогію мы напісалі. Думаю, да Новага года ў нас ужо будзе праектнае рашэнне, і мы пачынаем гэты працэс. Такім чынам мы запоўнім наш мясакамбінат з забойнай пляцоўкай на 50-60 % уласнай сыравінай. Гэта дасць магчымасць якасна, на асобную вытворчасць, палічыць выдаткі, рэнтабельнасць і атрымаць фінансавы вынік», — далажыў Уладзімір Лук'янаў. Калі эксперымент атрымаецца, ён будзе растыражаваны і ў іншых філіялах агракамбіната.

«Трэба імгненна гэта будаваць. Паралельна ўсё рабіць», — адзначыў Прэзідэнт і настроіў на тое, што тэрміны павінны быць максімальна сціснутымі. Цяпер у агракамбіната ў рэалізацыі 7 розных інвестпраектаў, якія фінансуюцца часткова за кошт уласных сродкаў і часткова — крэдытаў Банка развіцця. У тым ліку прадпрыемства задзейнічана ў рэалізацыі праграмы «Адзін раён — адзін праект». Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, добра, што банк дапамагае тым прадпрыемствам, якія заўтра дадуць аддачу, але не варта на іх зацыклівацца: «Не значыць, што мы маліцца на яго павінны, таму што ёсць такое добрае прадпрыемства. Павінны развівацца і іншыя прадпрыемствы».

Прэзідэнт звярнуў увагу і на тое, што кіраўнікі такіх буйных і, самае галоўнае, паспяховых прадпрыемстваў, як «Дзяржынскі», павінны рыхтаваць сабе змену. «Заўтра цябе няма. Хто замест цябе?» — паставіў пытанне беларускі лідар. Гэта, вядома, датычыцца не толькі «Дзяржынскага» і Уладзіміра Лук'янава. «Нам трэба бачыць тут людзей, якія заўтра створаць такую гаспадарку. Калі мы будзем такое ствараць, у нас праблем не будзе з прадуктамі харчавання і іншымі пытаннямі», — сказаў беларускі лідар.

### ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР, ВАКЦЫНАЦЫЯ, ТЭХНАЛОГІІ

Для таго каб вырашыць праблему з падзяжом жывёлы, трэба прымаць пад увагу шэраг фактараў. На іх у сваім дакладзе спыніўся старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір Каранік. «Сітуацыя з падзяжом жывёлы некалькі стабілізавалася, але ўсё роўна не радуе. За пяць месяцаў гэтага года паказчык вырас на 1,7 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года», — адзначыў ён.

Адзін з ключавых фактараў падзяжу жывёлы — чалавечы фактар. Як правіла, расцёл адбываецца ноччу, і ў гэты час на многіх фермах дзяжураць супрацоўнікі, якія не заўсёды могуць прыняць роды ў каровы і паклапаціцца аб цяляці ў першыя хвіліны жыцця. Для гэтага неабходна належным чынам арганізаваць работу супрацоўнікаў. І зноў гаворка аб праславутай выканальніцкай дысцыпліне.

Важны фактар — фарміраванне імунітэту ў цялят, вакцынацыя. Па словах Уладзіміра Караніка, нярэдкія выпадкі, калі вакцыны прымяняюцца неадэкватна. Ён звярнуў увагу, што ў кожнай гаспадарцы павінен быць распрацаваны свой план вакцынацыі з улікам эпізаатычнай сітуацыі на месцы, але часта планы не абнаўляюцца альбо бяруцца шаблонна з суседніх гаспадарак. Парушаюцца спосабы і дозы ўвядзення, захоўвання і транспарціроўкі. З-за гэтага вакцыны не працуюць. Адзін з варыянтаў вырашэння праблемы — кантроль выканання патрабаванняў аб распрацоўцы і выкананні планаў вакцынацыі з улікам сітуацыі з боку раённых ветстанцый. Уладзімір Каранік таксама прапанаваў разгледзець магчымасць правядзення цэнтралізаванай закупкі вакцын на ўзроўні раёна або вобласці, каб забяспечыць абарону пагалоўя, незалежна ад фінансавага стану гаспадаркі.

Прапанову цэнтралізаваць сістэму вакцынацыі жывёл назваў правільнай і намеснік Старшыні Усебеларускага народнага сходу Аляксандр Косінец. Ён таксама звярнуў увагу на вытворчасць айчынных вакцын і кантроль за іх якасцю.

Уладзімір Каранік падкрэсліў неабходнасць карэктна выбудаваць работу ветэрынарных урачоў. Напрыклад, цэнтралізаваць сістэму, каб раённая ветстанцыя забяспечвала ветэрынарнае суправаджэнне па ўсім раёне.

Па словах кіраўніка НАН, на сёння лабараторная дыягностыка інфекцыйных захворванняў не ў поўнай меры забяспечвае ветэрынарную службу неабходнай інфармацыяй. Частка методык або састарэла, альбо валодае недастатковай дакладнасцю. І тут ветэрынарам можа дапамагчы медыцына. Уладзімір Каранік нагадаў, што падчас пандэміі COVID-19 былі значна пашыраны магчымасці лабараторнай службы ПЛР-дыягностыкі, якія дазваляюць хутка выяўляць розныя антыгены. У найбліжэйшы час спецыялісты прадставяць прапановы, як зрабіць лабараторную дыягностыку ў ветэрынарыі больш аператыўнай і сучаснай.

Асобна звярнулі ўвагу на эфектыўнасць вырошчвання некаторых парод буйной рагатай жывёлы. Разгледзелі гэта пытанне на прыкладзе галштынскай пароды. Гэта адна з самых прадукцыйных малочных парод у свеце, але толькі пры строгім захаванні нормаў кармлення і рацыёну.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

# «...НАМ ТРЭБА ЛЮДЗЕЙ НАКАРМІЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 2–3 стар.)*

«Мы павінны прымаць рашэнне: або па-ранейшаму гэтак жа інтэнсіўна выкарыстоўваем гэтых кароў незалежна ад таго, ёсць тэхналогіі ці не, альбо працуем над генетычнай разнастайнасцю», — адзначыў Уладзімір Каранік. У Беларусі ёсць таксама досвед работы з дацкай чырвонай пародай кароў, іх вырошчваюць у сельгаспрадпрыемстве «Вусце» — гэта хоць і менш прадукцыйная, але больш устойлівая парода. Кіраўнік НАН прапанаваў узяць частку пагалоўя са статка і паспрабаваць папрацаваць з гэтай пародай на базе адной з перадавых гаспадарак краіны ў Брэсцкай або Гродзенскай абласцях. Прэзідэнт такі падыход падтрымаў.



Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што ўсе выказаныя прапановы трэба аформіць у канкрэтныя рашэнні. Паводле яго слоў, важна не проста чарговы раз слухаць размовы і лекцыі аб прадухіленні падзяжу жывёлы, але і прымаць рэальныя меры. Гэта датычыцца цэнтралізацыі ветэрынарнай службы, прымянення напрацовак аховы здароўя ў ветэрынарыі — Прэзідэнт патрабуе ад спецыялістаў выпрацаваць адзінае меркаванне і ўнесці канкрэтныя прапановы. Ён запэўніў, што па разумных, вывераных ідэях рашэнне прымаецца на працягу сутак.

Аляксандр Партной, кіраўнік навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па жывёлагадоўлі, адзначыў, што шлях прамысловай вытворчасці ў жывёлагадоўлі быў абраны абсалютна правільна. «Мы сёння не можам вярнуцца да дробнатаварных ферм і займацца вытворчасцю малака на гэтых фермах. Для таго каб выконваць тэхналогіі, мы павінны будаваць гэтыя сучасныя прамысловыя комплексы», — сказаў Аляксандр Партной. Але, звярнуў увагу Прэзідэнт, калі хтосьці хоча займацца фермерствам і мець 20, 30, 50 галоў жывёлы — то няма ніякіх праблем.

Кіраўнік навукова-практычнага цэнтра па жывёлагадоўлі падкрэсліў, што тэхналогіі ўтрымання жывёл, догляду маладняка даўно вядомыя. Самае галоўнае — перадаць іх работнікам, данесці, што трэба працаваць па тэхналогіях і правілах. Па словах Аляксандра Партнога, з гэтым нярэдка бываюць складанасці, але ў цэлым пытанне вырашаецца, і работнікі гатовыя вучыцца таму, чаго не ведалі, і працаваць па правілах.

## «ВОСЬ ВАМ ПАЎНАМОЦТВЫ, АЛЕ І АДКАЗНАСЦЬ. РАБІЦЕ»

Прэзідэнт звярнуў увагу, што часы мяняюцца, тэхналогіі мяняюцца, і веды нават спецыялістам трэба абнаўляць і папаўняць. Але без дысцыпліны — гэта ўсё пустая размова. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што заўтра мы не вырабім патрэбную колькасць вакцын і лекаў. «Паўстае пытанне, якое ляжыць на паверхні: «Хто пацікавіўся якасцю?» Калі б мы закупілі патрэбнай якасці і патрэбнае, то, напэўна, быў бы і вынік зусім іншы. Але мы і гэта не пракантралявалі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, трэба прымаць рашэнні там, дзе гэта сапраўды патрэбна і дзе прынясе рэальную карысць. «Вы на месцах людзі, якія пасля Прэзідэнта за гэта адказваеце. А я дакладней скажу: разам з Прэзідэнтам. Рабіце. Не ведаеце як, — ідзіце, вучыцеся. Вы займаеце вялікія пасады, вы несяце пэўную адказнасць. Я вас стаўлю нароўні з Прэзідэнтам. Вы прасілі паўнамоцтвы — вось вам паўнамоцтвы, але і адказнасць. Зрабіце так, як мы сёння гэта ўбачылі», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да ўдзельнікаў мерапрыемства. Ён падкрэсліў, што няма значэння, якія будуць прымяняцца метады работы — старыя ці сучасныя, галоўнае, каб былі вынік і парадак. І яшчэ, папярэдзіў Прэзідэнт, размовы пра тое, што кіраўнікі не ведаюць, як рабіць, пасля гэтага семінара не прымаюцца. «Вы ведаеце, што такое малочнатаварны комплекс. Гэта наша будучыня. Гэта грошы нашых сялян, таму што малако сёння рэнтабельнае. Будзе малако, будзе і мяса, ялавічына», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што ў цэлым з ялавічынай сёння праблем няма. Ёсць некаторыя пытанні па свініне, але і яны вырашальныя.

## «ДАВАЙЦЕ ПАДЫХОДЗІЦЬ РАЗУМНА»

Кіраўнік дзяржавы даручыў самым сур'ёзным чынам падысці да пытання будаўніцтва свінагадоўчых комплексаў. І паставіў задачу дакладна вызначыць: што больш мэтазгодна — пабудаваць комплекс на 100 тысяч галоў (пры такой канцэнтрацыі ў разы вырастае рызыка ўзнікнення хвароб і інфекцый) або чатыры комплексы на 25 тысяч галоў (у такіх комплексах прасцей выбудаваць работу). Трэба таксама вывучыць усе аспекты, адзначыў Прэзідэнт. Напрыклад, наяўнасці гарантаванай кармавой базы, захавання выканальніцкай дысцыпліны і тэхналогій. Аляксандр Лукашэнка патрабуе ўсё ўважліва вывучыць, пралічыць, прааналізаваць і прыняць канкрэтнае рашэнне.

Віцэ-прэм'ер Юрый Шулейка і старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко адзначылі, што будаўніцтва «статысячніка» дасць вобласці большую эканамічную аддачу. Яны вынеслі на разгляд кіраўніка дзяржавы прапанову ўзвядзення такога вялікага комплексу ў Гомельскай вобласці.

«Давайце падыходзіць разумна. Я буду рады і шчаслівы, калі ў Гомельскай вобласці мы пабудуем нейкія свінакомплексы і яны там будуць паспяхова, — прывёў прыклад кіраўнік дзяржавы. — Таму што нам Гомельскую вобласць трэба развіваць. А гэта — развіццё. Але калі яны не могуць — няма чаго туды і хадзіць».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адзін аспект, звязаны з будаўніцтвам комплексаў. «Калі мы канцэнтруем вытворчасці, мы збіраем у кучу людзей. Часам мы збіраем неабдумана. І мы губім тыя вёскі, якія раней былі цэнтрамі тых гаспадарак, якія мы далучылі. Раней была вёска, цэнтр гаспадаркі. Потым аб'ядналі дзве гаспадаркі, аграгарадок у адной, а другая ўжо гіне, а магла б быць фермачка, комплекс, але не такі, не паўтары тысячы, а на 300-400 галоў дойнага статка. І людзі б там жылі, і жыллё б будавалі, — звярнуў увагу ён. — Каб захаваць вёскі, трэба будаваць вытворчасць каля вёскі. Трэба думаць, трэба не губіць буйныя вёскі».

## «ТРЭБА РУХАЦЦА І ЗАЙМАЦЦА СПРАВАЙ»

Прэзідэнт пацікавіўся ў губернатара Міншчыны Аляксея Кушнарэнкі станам спраў і настроем у рэгіёне. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта самая складаная вобласць краіны, таму што тут усё ёсць. Старшыня аблвыканкама адказаў, што ёсць праблема з падзяжом буйной рагатай жывёлы. Але ў цэлым сітуацыя кантраляваная і ўжо прымаюцца меры для вырашэння гэтай праблемы. Самыя праблемныя гаспадаркі знаходзяцца на кантролі.

Прэзідэнт спытаў, якую галоўную праблему Аляксей Кушнарэнка як новы чалавек у губернатарскім складзе вызначыў для сябе. Кіраўнік Мінскай вобласці назваў адсутнасць дысцыпліны, тэхналагічнай і арганізацыйнай. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў яго няма перадузятага стаўлення да таго ці іншага рэгіёна, але калі недзе будзе абыякавасць і не будзе дысцыпліны — то і спытае з кіраўнікоў адпаведна.

«Вы ведаеце, што трэба рабіць і як трэба рабіць. Трэба рухацца і займацца справай», — адзначыў Прэзідэнт.

Падводзячы вынікі семінара-нарады, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ўзор «Дзяржынскага» — гэта тое, да чаго павінны імкнуцца ўсе сельгасарганізацыі. І гэта цалкам магчыма. Але трэба працаваць. «Я вас не ўгаворваю. Вы людзі дзяржаўныя. Я вызначаю курс — вы яго выконваеце. Я вам кажу: разам са мной давайце станавіцца ў рад і дзейнічаць, нягледзячы на тое, што мы кагосьці там пакрыўдзім. Ды мы павінны далікатна ўсё рабіць, старацца нікога не пакрыўдзіць. Але трэба дзейнічаць. Патрэбен вынік», — арыентаваў беларускі лідар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**
*Мінскі раён.*


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига 40, пом. 46, оф. 2, УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский, с/с, 19. УНП 100122846 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Полуавтоматич. флексограф. печат. просекательно-рилевочная машина, модель YKS-1225**, инв. № 323Т | **58 680,00** |
| 2 | **Полуавтоматич. флексограф. фечат. просекательно-рилевочная машина, модель BYKM-II 1200*1200**, инв. № 515Т | **14 130,00** |
| 3 | **Пакетоделат. машина ZH-GJHD-800**, 2013 г. в., инв. № нф00068 | **27 028,68** |
| **Лоты №№ 4 – 12 – стеллажи Praktisch пристенные** | | |
| 4 | **Стеллаж с доп. стойкой** 2250*1250*770, инв. № 7002 | **829,52** |
| 5 | **Стеллаж** 2250*1250*570, 2250*1000*570, инв. № 7003 | **1 733,42** |
| 6 | **Стеллаж** 2250*1000*470, 2250*237*370, инв. № 7006 | **1 239,47** |
| 7 | **Стеллаж** 2250*1250*470, 2250*1000*470, 2250*1022*470, инв. № 7007 | **3 163,99** |
| 8 | **Стеллаж островной** 1500*1000*570 и 470, 1500*1330*470, инв. № 7008 | **1 487,05** |
| 9 | **Стеллаж островной** 1500*1330*570, 1500*1250*470, инв. № 7009 | **1 453,24** |
| 10 | **Стеллаж** 2250*1250*470, 2250*1000*470, 2250*665*470, инв. № 7010 | **1 535,49** |
| 11 | **Стеллаж** 2250*1000*470, 2250*665*470, инв. № 7011 | **2 337,26** |
| 12 | **Стеллаж с доп. стойкой** 2250*1000*470, инв. № 7012 | **995,71** |
| 13 | **Прицеп бортовой тентовый MAZ 870110**, 2015 г. в., р. зн. А7361 В-5 | **8 400,00** |
| 14 | **Автопогрузчик-1014**, инв. № ф12230 | **6 840,00** |
| 15 | **Сварочный агрегат АДД-400** (склад № 3), инв. № ф12400 | **1 500,00** |
| 16 | **Автопогрузчик CPCD15NRW3FV3000**, инв. № 9207 | **15 060,00** |
| 17 | **Автопогрузчик Mitsubishi FD20NT**, инв. № 320Т | **19 140,00** |
| 18 | **Ополаскиватель ОПЛ-1** (адаптированный под бутылки 5 л) линия розлива масла и воды, инв. № 9498 | **5 580,00** |

Начальная цена снижена: по лоту № 1 – на 40 %, по лоту № 2 – на 85 %, по лоту № 3 – на 30 %, по лотам №№ 4–12 – на 7 %, по лотам №№ 13–18 – на 50 %.
**Шаг аукциона – 5 %** от начальной цены

Местонахождение лотов №№ 1, 2, 17 – г. Минск ул. Бабушкина, 22, лотов №№ 4–12 – г. Минск, ул. Калиновского, 6, лотов №№ 3, 13–15 – Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25, лотов №№ 16, 18 – Минский р-н, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 58.
Демонтаж, погрузка и транспортировка проводится за счет покупателя

**Задаток 10 % от начальной цены** в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: лоты №№ 1, 2 – 30 календарных дней, лоты №№ 3–18 – 10 календарных дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** 100 % оплата стоимости в течение **10 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги (www.ipmtorgi.by). **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (во вкладке «Документы»). Страница лота содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере от 4 % до 10 % от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов (информация на сайте ipmtorgi.by)

Предыдущее извещение опубликовано в г. «Звязда» от 14.05.2025 (лоты №№ 1, 3–18), от 02.04.2025 (лот № 2)

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.07.2025 с 11.00 до 12.00**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Дата и время окончания приема заявок** на участие в электронных торгах принимаются **по 01.07.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | +375 17 310-36-37; +375 29-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by |



РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего РУП «Белгипроводхоз» на праве хозяйственного ведения (Продавец).
Аукцион состоится **09.07.2025 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

**Лот № 1. Автомобиль SAMAND LX**, кузов (рама) № Y3W2PSMLX9FNX0647 NAAC91CC69F166561, 2009 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 1 503,01 руб.
Место нахождения Лота № 1: г. Минск, пр-т Машерова, д. 25.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by

Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, ☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

# ДАКРАНУЦЦА ДА ГІСТОРЫІ НА САЮЗНЫМ МАРШРУЦЕ




## ГІСТОРЫЯ І ГЕАГРАФІЯ

Нагадаем, што першы «Цягнік Памяці» адправіўся ў падарожжа са школьнікамі ў 2022 годзе. Праект быў ініцыяваны кіраўнікамі Савета Рэспублікі Беларусі і Савета Федэрацыі Расіі Наталляй Качанавай і Валянцінай Матвіенка. Яго мэта — здружыць дзяцей з розных краін, нагадаць пра гісторыю і подзвіг брацкіх народаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

— Гэта ініцыятыва паказала сваю эфектыўнасць і выніковасць. Акцыя аб'ядноўвае моладзь, дазваляе хлопцам і дзяўчатам рэалізаваць творчы і інтэлектуальны патэнцыял, завесці новыя знаёмствы, несці ідэі сваёй краіны, бо менавіта моладзь з'яўляецца правадніком ідэалогіі нашай дзяржавы, — адзначыў **намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Міністэрства адукацыі Віктар ФІЛІПЕНКА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па выніках рэспубліканскага конкурсу "Я патрыёт сваёй краіны» маладыя людзі дэманстравалі свае творчыя здольнасці, прэзентавалі вынікі даследчай работы. Ім прапаноўвалася прайсці тры конкурсныя выпрабаванні: візітоўка, партфоліа і эсэ, прысвечанае 80-годдзю Вялікай Перамогі. Адбор праходзіў у некалькі этапаў. У ім паўдзельнічала каля 9 тысяч школьнікаў. У выніку са 105 фіналістаў абласных этапаў на рэспубліканскім было абрана 40 пераможцаў. Усяго ў акцыі бяруць удзел каля 200 школьнікаў з розных краін свету.

Дарэчы, геаграфія краін-удзельніц праекта год ад году пашыраецца. Летась, напрыклад, да пасажыраў «Цягніка Памяці» далучыліся школьнікі з Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана і Узбекістана.

— Гісторыя акцыі пачалася ў 2022 годзе з удзелу хлопчыкаў і дзяўчынак Беларусі і Расіі. У далейшым на працягу трох гадоў геаграфія пашыралася, колькасць удзельнікаў павялічвалася. Летась было ўжо 8 дзяржаў. Сёлета ў рамках мерапрыемстваў, якія пройдуць у пачатку акцыі «Цягнік Памяці», колькасць краін стане яшчэ большай, — адзначыў Віктар Філіпенка.

Маршрут «Цягніка Памяці» заўсёды ўключае ўнікальныя месцы. Арганізатары прадугледзелі такія аб'екты, якія маюць асаблівы сімвалізм у гісторыі Вялікай Перамогі. Сёлета яны вельмі старанна падышлі да падбору рэгіянальных праграм, таму для ўдзельнікаў будуць прадугледжаны пункты на карце, якія ўсім вядомыя, але пры гэтым змяшчаюць унікальныя звесткі і інфармацыю аб славутасцях, звязаных з гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны.

## ЭКЗАМЕН ДЛЯ ПЕДАГОГАЎ

Адбор для ўдзелу ў праекце праходзілі не толькі школьнікі, але і педагогі, якія будуць суправаджаць дзяцей у якасці важатых. Усе ахвотныя настаўнікі паўдзельнічалі ў конкурсе «Перамогу шануем, герояў памятаем», арганізаваным Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтрам «Зубраня». Ён праводзіўся ў тры этапы. Педагогі прадставілі відэавізітоўку, а таксама свае прапановы па арганізацыйна-метадычных мерапрыемствах, якія будуць праводзіцца падчас падарожжа. Сярод патрабаванняў да прэтэндэнтаў — вышэйшая педагагічная адукацыя, вопыт работы не меншы за тры гады, у тым ліку ў выхаваўча-аздараўленчых установах краіны.

Як расказаў **загадчык аддзела вучэбнай работы Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня» Ігар НОВІКАЎ,** на працягу ўсяго маршруту важатыя будуць арганізоўваць вольны час школьнікаў, праводзячы ў тым ліку конкурсы, віктарыны і інш. Канцылярскія прылады, настольныя гульні і нават музычныя інструменты для гэтага загадзя падрыхтаваны.

— Як удзельнік другога «Цягніка Памяці» адзначу, што сяброўства, якое завязваецца падчас такога падарожжа, застаецца надоўга. Чаты, якія мы тады стварылі, жывыя дагэтуль — мы кантактуем, віншуем адзін аднаго са святамі, прыязджаем у госці да расіян, а яны — да нас, — падзяліўся Ігар Новікаў.

Сярод настаўнікаў, якія паедуць у гістарычнае падарожжа ад нашай краіны, і **педагог-арганізатар сталічнай гімназіі № 30 Кацярына ВАРАНКОВА.** Яна прызналася, што канкурэнцыя была сур'ёзнай: з 14 фіналістаў выбралі ўсяго чатырох найлепшых.

— Мне складана было ўмясціць у тры хвіліны ўсе свае дасягненні, — усміхаецца Кацярына. — Асабіста мне матывацыя дапамагае дасягаць пастаўленай мэты. З нецярпеннем чакаю, калі пазнаёмлюся са сваімі дзецьмі. Падрыхтавала цікавыя гульні з элементамі трэнінгаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

# «ЛІЧБА» У ДАПАМОГУ

## ВЫТВОРЧАСЦЬ СА ШТУЧНЫМ ІНТЭЛЕКТАМ

Цэнтральным экспанентам выстаўкі стаў холдынг «Гарызонт», які сёлета адсвяткуе свой 85-гадовы юбілей. **Генеральны дырэктар ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Гарызонт» Юрый ПРАДКО** падзяліўся, што ў жніўні яны плануюць адкрыць поўнасцю аўтаматызаваны завод па вытворчасці комплексаў са штучным інтэлектам.

— Сёння час складанасцяў і магчымасцяў. Улічваючы, што ў нас у аснове ляжыць стратэгія вытворчасці, мы ў найбліжэйшы час адкрыем некалькі заводаў. Адзін з іх, вядома, прысвечаны лічбавай электроніцы — гэта завод аўтаматызаваны, з вялікай колькасцю робатаў, якія павысяць якасць і адкрыюць новыя магчымасці для спажыўца. Там будзе выраблацца прадукт — нават не тэлевізар, а станцыя або комплекс, які будзе валодаць штучным інтэлектам. У яго будзе ўкаранёна шмат магчымасцяў: з ім можна размаўляць, задаваць пытанні, выконваць праграмы, вынаходкі. Гэта тое, пра што мы гаварылі вельмі многія гады: дамашні памочнік ва ўсіх галінах, у тым ліку і ў кіраванні кухоннай, дамашняй і іншай тэхнікай, суразмоўнік, які дапаможа і ў развіцці, і адказаць на пытанні. Ён дазволіць чалавеку адчуць сябе больш камфортна, — расказаў журналістам Юрый Прадко.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




## РАСПРАЦОЎКІ МАЛАДЫХ

Адметна і тое, што ў экспазіцыі таксама можна азнаёміцца з перспектыўнымі стартапамі моладзі. На прасторах выстаўкі мы пазнаёміліся з **навучэнцам гімназіі № 13 Мінска Яраславам ТУЛЯКОВЫМ.** Яго інтэлектуальны прамысловы робат стаў праектам — пераможцам рэспубліканскага конкурсу інавацыйных праектаў.

— Прататып прамысловага робата ўмее пісаць, маляваць і выпальваць з дапамогай лазера. Ён распрацоўваўся для дзвюх мэт: першая — праверыць канструкцыю, механізм, другая — даследаваць праграмнае забеспячэнне. Пасля гэтага быў распрацаваны ўжо чатырохвосевы прамысловы робат, які зможа перамяшчаць аб'ект з канвеера на палет. Таксама на канчатковым выканаўчым механізме робата можа быць размешчаны зварачны апарат пры неабходнасці, — падзяліўся малады чалавек.

На гэтым распрацоўкі Ярослава, прадстаўленыя на выстаўцы, не заканчваюцца. Паверхам ніжэй размясціўся яшчэ адзін інавацыйны праект маладога чалавека: інтэлектуальны гуманоідны робат, з якім можна пракансультавацца, пагутарыць на любую тэму і нават папрасіць прачытаць кнігу.

## КАНТРОЛЬ ЗА ПАРУШЭННЯМІ

Нашы праваахоўнікі з цікавасцю вывучалі распрацоўкі расійскіх інжынераў. А ўсё таму, што расіяне прадставілі на выстаўцы праграмна-апаратны комплекс фотавідэафіксацыі парушэнняў правілаў дарожнага руху.

— Ён устанаўліваецца на патрульны транспартных сродак, працуе як у руху, так і стацыянарна, — падзялілася **менеджар па рабоце з ключавымі кліентамі ТАА «Арсенал рэгіёны» Юлія ХАКІМАВА.** — Фіксуецца перавышэнне хуткасці, язда па абочыне, праезд на чырвонае святло, адпаведна, ідзе распазнаванне дзяржаўных рэгістрацыйных знакаў, марак, мадэляў транспартных сродкаў, ажыццяўляецца таксама работа з базамі вышуку. Дапусцім, калі аўтамабіль знаходзіцца ў базе вышуку і комплекс яго зафіксаваў, інфармацыя паступае непасрэдна на планшэт, дзе супрацоўнік бачыць, што машына ў вышуку, і, адпаведна, яе спыняе.

Комплексы даволі запатрабаваныя і ўжо працуюць у Бранску, Ліпецку, Смаленску, а таксама пастаўляюцца ў Казахстан. Хто ведае, можа, калі-небудзь яны з'явяцца і ў Беларусі.

***

На выстаўцы яшчэ шмат цікавых лічбавых цікавостак. Убачыць іх можна да пятніцы ў сталічным выставачным комплексе на праспекце Пераможцаў, 14.

**Лізавета ГОЛАД.**
**Фота аўтара.**





ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов
в форме открытого аукциона
по продаже имущества
унитарного предприятия
«СИ-трейдинг-Строй»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2101 | Изолированное помещение с инвентарным номером 600/D-100587 (назначение – административное помещение, наименование – изолированное помещение, общая площадь – 51,2 кв. м | 200000,00 | 20000,00 | 10000,00 |
| В отношении лота проводятся первые торги | | | | |
| **Местонахождение:** Минская область, Минский район, Боровлянский с/с, д. Копище, ул. Лопатина, 7А/1-1308 | | | | |
| В отношении лота № 2101 имеется ограничение (обременение) в виде залога. Подробная информация по телефону +375293110464 (Анастасия) | | | | |
| Дата и время проведения торгов | **21 июля 2025 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | |
| Срок приема заявлений и внесения суммы задатка | С 10.00 18 июня 2025 года до 16.00 17 июля 2025 года | | | |

**Условия для участия в торгах:** 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту № 2101, унитарное предприятие «СИ-трейдинг-Строй», проводимых 21.07.2025.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31-33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: 5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 14 (четырнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **+375 (29) 650-45-60 Николай (пн – пт с 10.00 до 17.00).**

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | Строительное унитарное предприятие «СИ-трейдинг-Строй» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375173958917, info@p-k.by (220081, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, 7А/1-36, офис № 803, УНП 691526626) |
| **Организатор аукциона** | ООО «Фрондера», 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg |



Могилевский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, находящегося в хозяйственном ведении у Государственного предприятия «Проектный институт Могилевгипрозем»

Электронные торги состоятся 10.07.2025 в 11.00 на электронной торговой площадке GOSTORG.BY

**Лот № 1**

**Грузовой автомобиль UAZ 39099 Б-310,**

тип кузова – фургон, VIN № 39090090104248, 374100A0401262, г. в. – 2009, р/з АВ 0816-6, инв. № 4727. Начальная цена продажи: 5 150,00 бел. рублей с учетом НДС. Сумма задатка: 515,00 бел. руб.

**Лот № 2**

**Легковой автомобиль «ДАЧИЯ ЛОГАН»,**

тип кузова – седан, VIN № UU1LSDAHH37865157, г. в. – 2007, р/з 1028 ВА-6, инв. № 3815. Начальная цена продажи: 2 600,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 260,00 бел. руб.

На сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў асноўнай тэмай для абмеркавання стала рэалізацыя дзяржпраграмы «Рынак працы і садзейнічанне занятасці» на 2021—2025 гады. Як адзначыла старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА, завяршаецца чарговая пяцігодка, і цяпер праводзіцца аналіз праведзенай работы.

**Намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама Сяргей МЯСНІКОЎ** адзначыў:

— У перыяд з 2021 да 2024 года дзякуючы праведзеным мерапрыемствам удалося знізіць колькасць работнікаў, занятых на месцах са шкоднымі або небяспечнымі ўмовамі працы, больш чым на 16 %. Паказчыкаў удаецца дасягнуць дзякуючы набыццю сродкаў індывідуальнай абароны, новага абсталявання, якое мінімізуе вытворчыя рызыкі. Цяпер назіраецца значнае памяншэнне паказчыкаў у галіне медыцыны, прамысловай вытворчасці і сельскай гаспадаркі. Дзякуючы выкарыстанню сучаснага абсталявання можна не толькі скараціць, але і поўнасцю выключыць негатыўнае ўздзеянне на работнікаў у працэсе вытворчасці. У рамках праграмы плануецца штогадовае змяншэнне на 2 % колькасці рабочых месцаў, звязаных са шкоднымі і небяспечнымі ўмовамі працы. Яшчэ адзін важны паказчык праграмы — укараненне сістэм кіравання аховай працы на вытворчасці, — расказаў Сяргей Мяснікоў.

Акрамя таго, у Гродзенскай вобласці станоўчая дынаміка ў барацьбе з беспрацоўем. Яго ўзровень па методыцы міжнароднай арганізацыі складае 2,5 % пры прагнозным паказчыку не больш як 3,4 %. За чатыры гады дзеяння праграмы па дапамогу ў пошуку работы звярнулася больш за 90 000 чалавек і амаль 80 000 былі паспяхова працаўладкаваны. Ёсць магчымасць прайсці перападрыхтоўку і перанавучанне ў інтарэсах наймальніка.

Асаблівая ўвага — навучэнскай моладзі. У рамках дзеяння праграмы аказваецца садзейнічанне ў пошуку часовай занятасці моладзі.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**

# ПОМНІК ЛЯ ДАРОГІ

## Мемарыяльны комплекс у Рэкце будавалі ўсім Горацкім раёнам

Калі ехаць праз аграгарадок Рэкта па трасе Горкі — Орша, немагчыма не звярнуць увагі на мемарыял з 8 стэл. На іх пазначаны больш за 600 прозвішчаў. Гэта жыхары 22 вёсак Рэкцянскага сельсавета, якія пайшлі на вайну і не вярнуліся. Сімвалічныя свечка і журавы нагадваюць пра боль і смутак па абарваных вайной жыццях, якія захоўваюць у сэрцах нашчадкі. Помніку ўсяго два гады, дагэтуль гэтыя імёны заставаліся практычна ў невядомасці.



Помнік у Рэкце.

### У ПАЧАТКУ СЛАЎНЫХ СПРАЎ

**Наталля ШЧУРЭВІЧ** успамінае, што, калі яна ў 2019 годзе ўзначаліла Рэкцянскі сельсавет, тэма памяці аднавяскоўцаў-франтавікоў заставалася адкрытай. На тэрыторыі сельсавета быў адзіны помнік чырвонаармейцам, але ніводнага прозвішча з ліку землякоў там не прысутнічала. Жыхароў гэта вельмі хвалявала. Таму, калі яна прапанавала запоўніць прабел, ідэя была масава падтрымана. Адыграла ролю і тое, што ў Еўропе сталі зносіць помнікі савецкім воінам. Людзі былі абураны падобнымі дзеяннямі, і нікога ўгаворваць унесці грошы на будаўніцтва помніка не прыйшлося.

— Нашы старасты пайшлі па вёсках і сабралі больш чым шэсць тысяч рублёў, з якіх дзве тысячы ахвяраваў на добрую справу жыхар Рэкты Мікалай Васіленка, — расказвае старшыня сельсавета. — Яшчэ дзве тысячы рублёў выдзеліла прадпрыемства «Горкілён» і тысячу перадало раённае аддзяленне грамадскага аб'яднання «Фонд міру». У выніку на восем помнікаў у нас пайшло 9260 рублёў і амаль на такую ж суму была аказана спонсарская дапамога ў выглядзе будматэрыялаў.

— Разам з жыхарамі вырашалі, дзе паставіць помнікі, — расказвае Наталля Шчурэвіч. — Старшае пакаленне выказалася за тое, каб яны стаялі ля дарогі. У ранейшыя часы так заўсёды рабілі. Каб кожны, хто праязджае міма, ведаў, тут ляжаць героі, якім трэба пакланіцца.

### ІМЁНЫ НА ГРАНІЦЕ

**Староста аграгарадка Рэкта Любоў ВАЛЧКОВА** не толькі аказала садзейнічанне ў зборы сродкаў на памяць сярод насельніцтва, але і паклапацілася, каб на абеліскі трапіла як мага больш імёнаў. Яна 50 гадоў адпрацавала ў Рэкцянскай бібліятэцы і ўвесь час кантактавала з ветэранамі вайны. Запісвала іх успаміны, арганізоўвала сустрэчы. Прызнаецца, што тэма для яе вельмі важная. Яна нарадзілася ў 1949 годзе, і ёй выпала шчасце сустракацца з гераічнымі людзьмі. Гэтыя сустрэчы яна назаўсёды захавала ў сэрцы і памяці. Калі да друку рыхтавалася раённая кніга «Памяць», таксама дапамагала шукаць для яе імёны, удакладняла інфармацыю. Выручыла яна з інфармацыяй і цяпер.

— Для мяне правілам было падчас святкавання дзён вёсак зачытваць жыхарам гісторыю іх населенага пункта і імёны землякоў-воінаў, — расказвае яна. — А калі высвятлялася, што кагосьці з гэтага спісу не назвала, давала інфармацыю. Цяпер усе гэтыя запісы пайшлі ў справу. Хацелася ўсіх ахапіць, не забыць нікога. Калі звяралі спісы з Горацкім гісторыка-этнаграфічным музеем, некаторыя прозвішчы прыйшлося ў поўным сэнсе слова адстойваць. Даказваць, што яны не прыдуманыя. Затым гэтыя спісы зацвярджаліся на рэспубліканскім узроўні. Работа была зроблена вялікая.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Рэкцянскага сельсавета.**


Мясцовае Самакіраванне. Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10 936. Нумар падпісаны ў 19.30 17 чэрвеня 2025 года.**

# ЦЭНАВЫ МАНЕЎР



**Інфляцыйныя рызыкі ў масе сваёй ужо адбыліся. А дэфляцыйныя яшчэ могуць адбыцца**

**У маі інфляцыя не парадавала: у параўнанні са снежнем цэны выраслі на 4,5 працэнта, а з маем мінулага года — на 7,1 працэнта. Не будзем хітраваць: вынік трохі вышэйшы, чым меркавалася: па выніках года рост цэн не павінен перавысіць 5 працэнтаў. Фактычна, да сярэдзіны года Беларусь ужо выбрала ўвесь ліміт. Зрэшты, упісацца ў план яшчэ застаецца і магчымасць, і верагоднасць. Выбіліся з прагнозаў з прычыны, у тым ліку, і непрадбачаных абставін. Фенаменальна халодная вясна запозніла ўраджай ранняй гародніны і садавіны на некалькі тыдняў. Акрамя таго, з-пад цэнавага рэгулявання вывелі шэраг тавараў, некаторыя з якіх падаражэлі апераджальнымі тэмпамі. Іншае пытанне, што рынак адрэагаваў зніжэннем попыту. Таму ў летнія месяцы складаюцца высокія дэфляцыйныя фактары, якія, па логіцы, павінны прыбіць рост цэн і апетыты вытворцаў, пастаўшчыкоў і рознічных прадаўцоў.**

Высокая інфляцыя ў маі ў значнай ступені склалася з-за падаражання харчовых тавараў. Яны прыраслі ў гадавым выяўленні на 9,6 працэнта. У нейкай ступені бязладдзе. Але так аб'ектыўна склаліся абставіны, на якія не зусім і можна паўплываць. Красавік і май выдаліся амаль марознымі. І ўраджай ранняй гародніны і садавіны адклаўся дзесьці на 4-5 тыдняў. На рынку ўжо з'явілася і маладая бульбачка, і цыбуля свежага ўраджаю, і іншая вітамінная прадукцыя. Але масавы яе наплыў, мяркуючы па ўсім, здарыцца толькі да канца чэрвеня. Прыроду не падманеш, халодная вясна зрушыла цыклы вегетацыі ў каляндарным часе. Таму падаражэнне гародніны стала самым магутным — больш за 14 працэнтаў у параўнанні з маем 2024 года. І, натуральна, усплёск у такой значнай тавачнай групе не мог не адбіцца на агульнай інфляцыі.

Другі важны фактар, які адбіўся і на агульнай, і на харчовай інфляцыі, — зніжэнне ўзроўню цэнавага рэгулявання. Мяркую па асабістых адчуваннях: па шэрагу пазіцый цэны падкруціліся не так упэўнена, як на агародніннную групу, але вельмі істотна. Але такая ўжо, няхай даруе мне бізнес, традыцыя нашых вытворцаў, пастаўшчыкоў і прадаўцоў. Нават у асяроддзі самавітых топ-менеджараў, з велізарным досведам работы і нават профільнай і дадатковай адукацыяй, існуе ўпартая перакананасць: прадукты будуць браць, нават калі яны даражэюць. Маўляў, куды ж спажывец падзенецца. Тым больш даходы грамадзян растуць. Могуць і раскашэліцца. Могуць, але не хочуць.

У беларускага спажыўца існуе пачуццё ментальнай справядлівасці. І ён чуйна рэагуе на любое падаражанне. Асабліва калі не бачыць дакладнай абгрунтаванасці. Проста вывучаем статыстыку. Калі ялавічына пайшла даражэць, то за першы квартал і яе продажы знізіліся амаль на 17 працэнтаў. А вось рэалізацыя курацiны павялічылася больш чым на 4 працэнты. Пакупнік перамясціўся ў іншую нішу. І такіх прыкладаў можна прывесці шмат, калі ўважліва вывучаць статыстыку. Але ўдзельнікі рынку традыцыйна спрабуюць выпрабаваць попыт на трываласць. Дарэчы, рознічны тавараабарот у красавіку ў параўнанні з сакавіком знізіўся на 5,9 працэнта. Людзі пераходзяць на больш эканомны мадэлі спажывання. І гэта адбываецца на фоне росту і рэальных даходаў, і заработнай платы. Адпаведна, у адным з тэзісаў бізнес мае рацыю — грошы ў людзей ёсць. Але гэта далёка не значыць, што пакупнік гатовы плаціць любую цану. Таму традыцыйная сітуацыя развіваецца на спажывецкім рынку па арыгінальнай (на мой погляд, не самай эфектыўнай) схеме: спачатку тыя ці іншыя катэгорыі тавараў даражэюць (часам даволі рэзка), потым падае іх продаж, наступны крок — зніжэнне цэн. Інакш проста тавар перастае прадавацца і катэгорыя дэградуе.

Рызыкну выказаць здагадку: мы знаходзімся на мяжы ўплыву адразу некалькіх дэфляцыйных фактараў. Па-першае, зніжэнне аб'ёмаў рознічнага тавараабароту ў цэлым і па асобных пазіцыях у прыватнасці прымусіць усіх перагледзець цэнавую пазіцыю. Па-другое, збор свежай гародніны і садавіны ўвойдзе ў масавую стадыю. Надвор'е, дзякуй богу, усталёўваецца. Таму сезонная прадукцыя павінна таннець. І гэта будзе заўважна па ўзроўні інфляцыі. Па-трэцяе, змяншаецца попыт у Расіі, як і запавольваецца інфляцыя ў гэтай краіне. Значыць, ціск з боку экспартнага фактару будзе змяншацца. Па-чацвёртае, Нацыянальны банк пачаў праводзіць палітыку запаволення дынамікі спажывецкага крэдытавання. Чаму і для якіх мэт — асобная вялікая размова, але факт застаецца фактам: некалькі мільярдаў рублёў крэдытных грошай са спажывецкага рынку знікнуць, што падштурхне ўсіх удзельнікаў рынку яшчэ больш задумацца аб цэнаўтварэнні. Па-пятае, калі попыт, які рэзка і імкліва расце, ціснуў на наш спажывецкі рынак, правакуючы да інфляцыі, то цяпер, на фоне зніжэння, усё больш адчуваем ціск з боку расійскага імпарту.




Жывём у цікавы час. І чароды лебедзяў лунаюць у небе. Але не толькі чорныя і шэрыя — ёсць і белыя. Не заўсёды атрымліваецца адагнаць птушак цёмнай афарбоўкі, але светлыя таксама ўносяць свой эфект — пазітыўны. Згодна з Белстатам, за месяц цэны на агуркі знізіліся больш чым на 28 працэнтаў, на таматы — больш чым на 27, на часнок — на 12 працэнтаў, на перац салодкі — прыблізна на 10. Таму ўпісацца ў прагноз 5 працэнтаў па інфляцыі рэалістычна. Або выбіцца з паказчыка, але ў рамках хібнасці. Прынамсі, інфляцыйныя рызыкі ў масе сваёй ужо адбыліся. А дэфляцыйныя яшчэ могуць адбыцца.



Інтэлект ШТУЧНЫ


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ООО «Химтэкинвест» (организатор торгов) извещает о проведении четвертого повторного открытого аукциона на повышение начальной цены со снижением цены первого аукциона на 80 % по реализации объекта недвижимости: «Капитальное строение с инвентарным номером 252/С-64 общей площадью 863,2 кв. м. Назначение:

### ЗДАНИЕ

**специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (действующие договоры аренды).**

Расположено на земельном участке с кадастровым номером 241800000009000122 площадью 1,0085 га. (Право аренды по 31.12.2073, доля 1/2) в г. Новополоцке, ул. Промышленная, 11/1.

Собственник имущества – ООО «КД-Инвест» УНП 391298470, тел./факс (0214) 50-01-88.
Начальная цена – 37 400 белорусских рублей.
Сумма задатка – 1 870 белорусских рублей.
Шаг торгов – 1 870 белорусских рублей.
Цена без НДС (НДС сверху не начисляется п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ)
Данный лот находится в обременении в ипотеке, помещение сдано в аренду.
Начало подачи заявок – 19 июня 2025 года – 09.00.
Окончание подачи заявок – 30 июня 2025 года – 09.00. Заявки на участие в торгах принимаются по адресу: 211443, Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, д. 11А, пом. 20. Организатор торгов – ООО «Химтэкинвест», УНП 191685984. При необходимости ознакомиться с документами и предметом аукциона направлять запрос на электронную почту producomob2016@mail.ru или по тел 8-0339033614.
Начало торгов: 02 июля 2025 года в 10.00 по адресу: г. Новополоцк, ул. Молодежная 11А, комн. 20.

Торги проводятся при наличии двух и более допущенных к торгам участников. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. К участию в торгах допускаются физические и юридические лица, подписавшие соглашение до начала торгов об ознакомлении с предметом торгов и копиями договоров аренды; зарегистрированные в журнале регистрации заявлений; предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах, копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей; доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет руководитель); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Физическим лицам – предъявить паспорт, иной документ, подтверждающий личность.
Задаток перечисляется на р/с номер счета (IBAN): BY13SLAN30124208400000100000 в г. МИНСК, ЗАО БАНК ВТБ (БЕЛАРУСЬ), код банка (BIC): SLANBY22, УНП: 191685984, ООО «Химтэкинвест» до подачи заявки на участие в аукционе, назначение платежа: «Задаток за участие в торгах по капитальному строению с инвентарным номером (указать номер)».
Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней после дня проведения торгов (физическим лицам – на карт-счет, указанный при регистрации; юридическим лицам, ИП – на расчетный счет).
Участнику, выигравшему торги, задаток не возвращается и учитывается в счет оплаты предмета торгов по договору купли-продажи. Победитель торгов (либо единственный участник, давший согласие на приобретение лота), т. е. покупатель, подписывает протокол по результатам торгов в день его проведения, и в обязательном порядке возмещает затраты на организацию и проведение торгов в размере 349,27 бел. руб. в течение 5 (пяти) календарных дней после проведения торгов, а также обязан заключить договор купли-продажи с собственником предмета торгов в течение 2 рабочих дней после проведения аукциона. Срок оплаты предмета торгов: в соответствии с заключенным договором.
В случае если к участию в торгах был допущен только один участник, он может приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов (т. е. начальная цена + 5 % + затраты на организацию и проведение торгов) путем подтверждения приобретения в день торгов.
Продавцом предоставляется отсрочка оплаты предмета аукциона 50 дней с момента переоформления имущества на покупателя.
В случае отказа или уклонения победителя торгов (или единственного участника, давшего согласие на приобретение лота) от подписания протокола и (или) договора купли-продажи, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов, результаты торгов аннулируются, внесенный им задаток возврату не подлежит, а включается в состав имущества собственника предмета торгов.
Организатор оставляет за собой право отменить аукцион без объяснения причин не менее чем за трое суток до начала его проведения.
Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы на землю или земельного налога, а также ознакомиться с договорами аренды имущества. Ранее опубликованные объявления о предыдущих торгах 21 ноября 2024 года, 28 декабря 2024 года, 18 января 2025 года, 5 февраля 2025 года в этом же издании

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Несвижский райагросервис» (Продавец). Аукцион состоится 09.07.2025 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Лот № 1 в составе: 1. Гараж для автомашин с инв. № 621/С-1029368, 1359,1 кв. м. Земельный участок 624283500001000082 (0,819 га). Право аренды.
2. Гараж для автомашин с инв. № 621/С-1029367, 827,4 кв. м. Земельный участок 624283500001000081 (0,1393 га). Право аренды.
3. Мехмастерские с инв. № 621/С-1029370, 1090,3 кв. м. Земельный участок 624283500001000084 (0,97 га). Право аренды.
4. Электроцех мехмастерских с инв. № 621/С-1029371, 273,5 кв. м. Земельный участок 624283500001000083 (0,26 га). Право аренды.
Адрес: Минская область, Несвижский район, Несвижский с/с, 20/3, 20, 20/2, 20/1 вблизи г. Несвиж.
Начальная цена с НДС 20 % – 932 050,80 руб. Задаток – 93 205,08 руб. Шаг аукциона – 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by). Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 07.07.2025 в 11.00

Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, ☎ 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

СІТУАЦЫЯ

# ЗАДАЧА ДЛЯ ЎСЯГО ГРАМАДСТВА

## Нарказлачынстваў стала менш, але гэта не нагода для заспакаення

У нашай краіне адзначаюцца станоўчыя тэндэнцыі ў супрацьдзеянні распаўсюджванню наркотыкаў. Аднак гэтыя пытанні не губляюць сваёй актуальнасці. Праваахоўнікі сёлета за пяць месяцаў спынілі 19 каналаў пастаўкі наркотыкаў у Беларусь, канфіскавана больш за 400 кілаграм наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Асабліва ўразлівай катэгорыяй для ўцягвання ў незаконны абарот і спажыванне з'яўляюцца падлеткі. Якія меры прымаюцца ў нашай краіне для выяўлення нарказлачынстваў? Які метад прафілактыкі наркazалежнасці сярод падлеткаў самы дзейсны? Што самае галоўнае ў лячэнні і рэабілітацыі? Слова — экспертам.

### СПЫНЕНА ДЗЕЙНАСЦЬ 22 ІНТЭРНЭТ-КРАМ

Сёлета назіраецца зніжэнне нарказлачыннасці, у тым ліку і сярод непаўналетніх, змяншэнне смяротных передазіровак і колькасці грамадзян, дастаўленых з атручваннямі наркотыкамі ў медыцынскія ўстановы. Менш нарказлачынстваў учыняецца раней асуджанымі. Што датычыцца падлеткаў, то 19 з іх вынесена пастанова аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага за збыт наркотыкаў, гэта амаль на 40 % менш, чым летась.

Як падкрэслівае **начальнік аддзела галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Аляксандр ХІЛА**, лічбы сведчаць пра стабілізацыю наркасітуацыі ў краіне. Сёлета выяўлена больш за 1,7 тысячы нарказлачынстваў. Затрымана больш за 700 асоб, якія маюць дачыненне да незаконнага абароту наркотыкаў. У тым ліку да адказнасці прыцягнута 66 грамадзян замежных дзяржаў (летась за аналагічны перыяд іх было 27). Спынена дзейнасць 77 памяшканняў, прыстасаваных для вырошчвання наркаэмяшчальных раслін. Супрацоўнікамі аналітычнай разведкі падраздзяленняў па наркакантролі спынена дзейнасць 22 інтэрнэт-крам па продажы наркотыкаў.

За пяць месяцаў у арганізацыі аховы здароўя з дыягназам «атручэнне наркотыкамі» дастаўлены 128 грамадзян (з іх адзін непаўналетні). Гэта амаль на 30 % менш за аналагічны перыяд летась.

— Наркасітуацыя ў краіне мае наступныя характэрныя рысы: шырокае выкарыстанне магчымасцяў інтэрнэту як асноўнага рэсурсу для распаўсюджвання; арганізаваны характар наркабізнесу; бескантактны збыт (з яго дапамогай ажыццяўляецца больш як 95 % продажаў); шырокае ўцягванне ў збыт замежных грамадзян; распаўсюджанне асабліва небяспечных псіхатропных рэчываў, такіх як 4-СМС, альфа-PVP, мефедрон, — апісвае Аляксандр Хіла, дадаючы, што праваахоўныя органы са свайго боку прыкладуць максімум намаганняў, каб захаваць сітуацыю пад кантролем і не дапусціць ускладнення. Асноўны ўпор робіцца на першасную прафілактыку сярод падлеткаў, якія найбольш схільныя да дэструктыўнага ўплыву як інтэрнэту, так і сваіх сяброў і знаёмых.

### ЗАНЯТАСЦЬ ПАДЛЕТКАЎ І КАНТРОЛЬ ДАРОСЛЫХ

**Начальнік сектара каардынацыі і метадычнага забеспячэння прафілактыкі злачынстваў і правапарушэнняў сярод навучэнцаў Акадэміі адукацыі Маргарыта СУХАВЕНКА** расказала аб тым, які метад прафілактыкі нарказлачынстваў сярод непаўналетніх з'яўляецца найлепшым.

— Найлепшы метад прафілактыкі нарказлачынстваў — занятасць дзяцей, а таксама кантроль дарослых за іх баўленнем часу. Занятасць — не проста спосаб запоўніць вольны час дзіцяці, а важнейшы фактар, які садзейнічае фарміраванню ў непаўналетняга адказнасці і самадысцыпліны, — падкрэсліла Маргарыта Сухавенка.




Для эфектыўнай арганізацыі занятасці дзяцей ва ўстановах адукацыі ў красавіку і маі праводзілася анкетаванне бацькоў, з дапамогай якога вывучаліся іх меркаванне аб формах і відах занятасці, аздараўленні непаўналетніх. На афіцыйных сайтах устаноў адукацыі размешчана спасылка на партал дзяржаўнай службы занятасці, а таксама змяшчаецца актуальная інфармацыя аб летнім адпачынку навучэнцаў: распарадак школьнага лагера, графікі работы аб'яднанняў па інтарэсах, бібліятэк, спартыўных пляцовак.

— Паколькі цяпер праходзіць летняя аздараўленчая кампанія, мы робім акцэнт на аздараўленчых лагеры. Дадзены старт антынаркатычнага прафілактычнага праекта «Прa здароўе». Нашы валанцёры, студэнты ВНУ, педагагічныя работнікі праводзяць прафілактычную работу сярод выхаванцаў летніх аздараўленчых лагераў, дзе ў даступным фармаце расказваюць, наколькі небяспечнае ўцягванне ў незаконны абарот наркотыкаў, а самае галоўнае — нагадваюць пра адказнасць за распаўсюджанне. Адзін з самых дзейсных фарматаў — роўны навучае роўнага. Напрыклад, з выкарыстаннем стрымінгавых сэрвісаў, калі ўдзельнічаюць асуджаныя за незаконны абарот наркотыкаў равеснікі непаўналетніх, якія папярэджваюць, як не аступіцца, — расказала Маргарыта Сухавенка.

### КРОК ДАЎЖЫНЁЙ У МЕСЯЦ

Для рэабілітацыі нарказалежных Міністэрствам аховы здароўя ў кожным рэгіёне рэалізуюцца рэабілітацыйныя праграмы для дарослых, якія маюць доўгатэрміновы характар. У іх аснове ляжаць так званыя 12 крокаў, падчас якіх у чалавека фарміруецца высокая матывацыя да рэабілітацыі. Адзін крок — адзін месяц работы з пацыентам. Гэта праграма прыводзіць да перафармаціравання асобы і паводзінавых стэрэатыпаў.

Аснова поспеху «12 крокаў» — у забеспячэнні занятасці.

— Калі ў чалавека ёсць жыццёвая праграма, мэты, вызначаны крокі іх дасягнення, то яго цяжка будзе ўключыць у дэзадаптыўныя паводзіны, — адзначыў **намеснік дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце РНПЦ псіхічнага здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Сяргей ОСІПЧЫК.**

Ён таксама заўважыў, што чалавек, які ўваходзіць у праграму медыцынскай рэабілітацыі, дэзарганізаваны з пункту гледжання бытавога разумення і ўспрымання асобы.

— У яго крыху зрушаныя паняцці дня і ночы, снядanку, абеду і вячэры. Яму цяжка ўспрымаць вынік як паслядоўнасць неабходных дзеянняў. Таму калі чалавек робіць адзін крок і не дасягае выніку, то пачынае адчуваць сябе незадаволеным. З-за гэтага ён шукае рэчывы, якія могуць зрабіць рэальнасць прыемнай для ўспрымання. Праграма «12 крокаў» дапамагае чалавеку зарыентавацца ў навакольнай рэчаіснасці і сфарміраваць план паводзін, — адзначыў Сяргей Осіпчык.

Акрамя рэабілітацыйных праграм ва ўсіх рэгіянальных арганізацыях аховы здароўя запланавана стварэнне сістэмы антынаркатычных пляцовак. У Віцебску і Брэсце яны ўжо працуюць. Іх наведваюць старшакласнікі, якія сустракаюцца не толькі з валанцёрамі, але і з людзьмі з сіндромам залежнасці. Тут ізноў жа працуе прынцып «роўны навучае роўнага».

**Алена КРАВЕЦ.**


# ООО «СидНеА» организует конкурсные торги

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли–продажи/аренды) | Начальная цена: сумма в белорусских рублях, эквивалентная долларам США по курсу НБ РБ на день проведения торгов | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли–продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| 17.07.2025 10.00 | Продажа капитального строения – одноэтажное блочно–кирпичное здание лесопилорамы с кадастровым № 423355100001001731, с инв. № 431/С–20065 по адресу: Гродненская обл., Кореличский р-н, г. п. Кореличи, ул. Гастелло 52К | 6000 | 1075 кв. м | 2500 | 90 |
| 17.07.2025 10.30 | Продажа капитального строения – одноэтажное кирпичное здание склада с кадастровым № 423355100001001732 с инв. № 431/С–26947 по адресу: Гродненская обл., Кореличский р-н, г. п. Кореличи, ул. Гастелло 52Л | 6000 | 171,0 кв. м | 2500 | 90 |
| 17.07.2025 11.00 | Продажа капитального строения – одноэтажное кирпичное здание столярного цеха с кадастровым № 423355100001001734 с инв. № 431/С–20064 по адресу: Гродненская обл., Кореличский р-н, г. п. Кореличи, ул. Гастелло 52М | 6000 | 491,1 кв. м | 2500 | 90 |
| 17.07.2025 11.30 | Продажа жилого дома с инв. № 620/С–47593 с кадастровым № 622285510101000127 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, д. Первомай, ул. Луговая, д. 19 | 149000 | 89,2 кв. м | 2500 | 90 |
| 17.07.2025 13.00 | Продажа участка с кадастровым № 622085700009000238 по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, Раковский с/с, СТ «Инженер» | 7000 | 0,0408 га | 2500 | 90 |

**Повторные конкурсные торги**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 29.07.2025 11.00 | Продается юр. лицо ООО «Мужские Правила», свидетельство о гос. регистрации юридического лица выдано Минским горисполкомом № 0108342 от 10 ноября 2015 г., зарегистрированное по адресу: г. Минск, пр–т Независимости, д. 102–1Н, с правом аренды помещения, расположенного по адресу: г. Минск, пр–т Независимости, д. 102–1Н | 170 000 | 277.3 кв. м | 2500 | 90 |
| 17.07.2025 12.00 | Продажа участка с кад. ном. 623685500010000407 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Папернянский с/с, СТ «Ромашка Соломореченская», участок № 65 | 4000 | 0,0411 га | 2500 | 90 |
| 08.07.2025 13.00 | Продажа дома с инв. №. 602/U–55826, с кадастровым № 624484804101000009 по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Пережирский с/с, д. Заболотье, ул. Горная, д. 1 | 63 000 | 360.7 кв. м | 2500 | 90 |

**Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 96 (30484) от 21.05.2025**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 19.06.2025 13.00 | Продажа дачного дом,. с кадастровым № 623685700053000098 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, СТ «МАРА–РОСИНКА», д. 71 | 105000 | 114,1 кв. м. | 2500 | 90 |

**Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 108 (30496) от 06.06.2025 г., с изменен. конк. обеспеч., опубликованному в газете «Звязда» № 112 (30500) от 12.06.2025**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 07.07.2025 12.30 | Продажа участка кадастровым № 624882000055000114 по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Заболотский с/с, СТ «Стрелец–2014», 90 | 18500 | 0,1044 га | 500 | 90 |

**Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 112 (30500) от 12.06.2025**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 24.06.2025 11.00 | Продажа квартиры с инв. № 600/D–52768 по адресу: Минская обл., Минский р-н., Боровлянский с/с, аг. Лесной, ул. Н. Н. Александрова, д. 6, кв. 41 | 61500 | 37,4 кв. м. | 2500 | 90 |

**Изменение даты торгов по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 82 (30470) от 26.04.2025, с изменением даты торгов в газете «Звязда» № 96 (30484) от 21.05.2025, с изменением цены в газете «Звязда» № 88 (30476) от 08.05.2025**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 14.07.2025 10.00 | Продажа законсервированного строения с инв. № 630/U–83350 по адресу: Минская обл., Молодеченский р-н, Красненский с/с, д. Красное, ул. Илюшина, д. 57 | 45000 | 0,14 га | 2500 | 90 |

**Отмена конкурсных торгов по объектам:**

| |
|---|
| Продажа участка с кадастровым № 623686300601000002 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Самохваловичский с/с, д. Белица, участок № 1. Назначенных на 26.06.2025 в 10.00. Опубликованных в газете «Звязда» № 101 (30000489) от 28.05.2025 г. |
| Продажа дома, с кадастровым № 622280400015000112 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Боровской с/с, СТ «Лесное–Белмедпрепараты», Назначенных на 07.07.2025 в 16.00. Опубликованных в газете «Звязда» № 108 (30000496) от 06.06.2025 г. |

Торги состоятся по адресу: г. Минск. ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращаются за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж. Конкурсное обеспечение вноситься на р/с BY14MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22. Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов. Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли–продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденным приказом директора от 05.03.2024 № 9–ОД. Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов. Телефон для справок (+37529)171–50–50

# РУЖА ВЯТРОЎ ДЛЯ ЧЭМПІЁНАЎ

## Як на Брэсцкім вяслярным канале фарміруюць спартыўную эліту



Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы ў 2007 годзе Брэсцкі вяслярны канал, яго ўвядзенне ў эксплуатацыю і стварэнне тут цэнтра алімпійскага рэзерву па веславанні надасць новы імпульс развіццю і папулярызацыі адпаведных відаў спорту. Праз 18 гадоў усё так і ёсць. На вадзе кіпіць барацьба паміж лодкамі, а ў цэнтры алімпійскага рэзерву кіпіць жыццё. Дырэктар Брэсцкага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па веславанні Павел ДЗЕНІСЮК сцвярджае, што інакш тут і быць не можа. І патлумачыў «Звяздзе», чаму.

### НА ЎНІКАЛЬНЫМ АБ'ЕКЦЕ — УНІКАЛЬНЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ

«Наш аб'ект жыве спортам, менавіта для яго і ствараўся. Гэта цудоўны, адзін найлепшых у свеце (для нашай каманды дакладна найлепшы) цэнтр развіцця веславання і спецыялізаваны канал для вяслярных відаў спорту», — адзначае Павел Дзенісюк. У вяслярнага канала вельмі выйгрышнае размяшчэнне — тут удалая ружа вятроў і толькі або спадарожны, або сустрэчны вецер, ніякіх бакавых. За кошт гэтага ўсе спартсмены знаходзяцца ў абсалютна роўных умовах, і перамагае сапраўды наймацнейшы. У гэтым таксама вялікая перавага штучнага вадаёма перад натуральным. На азёрах, дзе часцей за ўсё праводзяцца спаборніцтвы па веславанні, можа адбыцца ўсё што заўгодна. І часта форс-мажоры ўплываюць на вынік спартсменаў. На штучных каналах гэта выключана — тут толькі сумленная і раўнапраўная барацьба, ну, то-бок веславанне.

Адметна, што будавалі канал брэсцкія спецыялісты. Дарэчы, адпаведны праект і досвед выкарыстоўваліся таксама пры ўзвядзенні цэнтра вяслярных відаў спорту ў Казані, які ствараўся да летняй Універсіяды 2013 года. Так дзякуючы школе спартыўнай узнікла яшчэ і ўнікальная інжынерная школа. Таму што абслугоўванне вяслярнага канала — цэлая навука. «У нас працуе 157 чалавек, але непасрэдна канал абслугоўваюць дзевяць — яны займаюцца абцягваннем, абкосам берагоў, чысткай, самі ўдзельнічаюць у спаборніцтвах у якасці суддзяў, матарыстаў, ратавальнікаў. Інжынерная служба складаецца з трох чалавек. І гэта без перабольшання ўнікальныя спецыялісты, якія працуюць з сістэмай IMAS. На постсавецкай прасторы такіх можна пералічыць па пальцах адной рукі. Таму і запатрабаваны ў іншых краінах, нядаўна нашы спецыялісты ездзілі ва Узбекістан, працавалі на чэмпіянаце свету», — адзначае Павел Дзенісюк.



Павел Дзенісюк і Алег Юрэня.

Недалёка ад Брэста знаходзіцца горад Белаазёрск, важнае для беларускіх весляроў месца. Там, на мясцовай ГРЭС, ёсць цёплы вадаём, дзе спартсмены трэніруюцца зімой. Усе весляры-чэмпіёны там трэніраваліся нават у моцныя маразы. Але асаблівых умоў для спартсменаў не было, не моцна распешчаным веслярам шмат не трэба. Цяпер у Белаазерску створаны філіял Брэсцкага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па веславанні. У цёплы час весляры ў Брэсце напрацоўваюць хуткасць, а зімой у Белаазерску назапашваюць сілу. Па словах Паўла Дзенісюка, бывае, што зімой на зборах там можа працаваць па 200 чалавек. А значыць, трэба ствараць адпаведныя ўмовы, напрыклад, на наступны год запланавана будаўніцтва новага корпуса.

Пуставаць ён дакладна не будзе, таму што ў абласным цэнтры алімпійскага рэзерву ўжо займаецца 500 спартсменаў. Пастаянна на зборах знаходзіцца нацыянальная зборная па акадэмічным веславанні. Менавіта на брэсцкім канале трэніраваўся да Алімпійскіх гульняў у Парыжы Яўген Залатой. Тут ён займаецца з 2018 года — практычна ўсю сваю дарослую кар'еру праводзіць у брэсцкай акваторыі, у Брэсце жыве і сям'я Залатых. Яго сярэбранаму алімпійскаму медалю ў мінулым ліпені радаваўся ўвесь цэнтр. Не меншай была радасць і ад нядаўняга залатога медаля на чэмпіянаце Еўропы. Дарэчы, для алімпійскага прызёра гэта першае такое золата.

Кацярына Карстэн, з чыім імем звязаныя самыя гучныя поспехі беларускага акадэмічнага веславання, на брэсцкім канале таксама свой чалавек — праводзіць тут увесь час у якасці трэнера маладзёжнай зборнай. «Нашым маладым спартсменам і трэнерам вельмі пашанцавала працаваць побач з Кацярынай. Гэта чалавек-легенда, наш гонар. Для спартсменаў яна жывы прыклад таго, што, калі працаваць і імкнуцца наперад, можна зрабіць немагчымае», — адзначае Павел Дзенісюк.

### АБСАЛЮТНА БЯСПЕЧНА І ВЕЛЬМІ ЗАЙМАЛЬНА

Усё вышэйпералічанае — праца, якая прыкметная і відавочная. Штодня спецыялісты Брэсцкага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па веславанні праводзяць і не прыкметную публіцы, але жыццёва важную дзейнасць. Падрыхтоўка рэзерву — тое, без чаго казаць аб спаборніцтвах, зборах, гледачах бессэнсоўна.

«Нашы трэнеры ведаюць расклад спартыўных мерапрыемстваў ва ўсіх раённых цэнтрах вобласці. Яны ездзяць туды і шукаюць перспектыўных дзяцей. Як правіла, гэта спаборніцтвы па веславанні, плаванні, лёгкай атлетыцы. Высокіх, фізічна развітых, моцных дзяцей запрашаем у цэнтр на прагляданыя збор, з абавязковым праходжаннем медыцынскай камісіі. Вядома, частка адсейваецца. А ў тых, хто падыходзіць па ўсіх паказчыках, хоча займацца веславаннем і чые бацькі не пярэчаць, пачынаецца новае жыццё ў нашым цэнтры. Сёння мы ўжо займаемся не наборам, а адборам дзяцей, таму што цікавасць да веславання значная», — распавядае Павел Дзенісюк.

Сярод выхаванцаў Брэсцкага абласнога цэнтра двухразовы чэмпіён свету, пяціразовы чэмпіён Еўропы па веславанні на байдарцы, удзельнік дзвюх Алімпійскіх гульняў Алег Юрэня. Чэмпіён Еўропы 2024 года і ўдзельнік Алімпійскіх гульняў у Парыжы Уладзіслаў Кравец — таксама прадстаўнік Брэстчыны. Таму ўнутраная канкурэнцыя ў Брэсцкім цэнтры алімпійскага рэзерву прыстойная. Але гэта толькі ў спорце. Па словах Паўла Дзенісюка, у цэнтры ўсе жывуць як адна сям'я: «Спачатку я быў уражаны тым, якія весляры згуртаваныя і дружныя хлопцы. Яны ўсе адзін за аднаго гарой. У нас трэніруюцца выдатныя дзеці. Яны мэтанакіраваныя, моцныя, матываваныя. А паколькі ў цэнтры пачынаюць трэніравацца з 10-12 гадоў, наша задача — не толькі падрыхтаваць іх як спартсменаў, але і выхаваць як асоб. Гэта складана. Але перамогі нашых спартсменаў вартыя любых цяжкасцяў. Дзеля гэтага мы і працуем».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота Брэсцкага цэнтра алімпійскага рэзерву**

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Добрушского райПО (продавец) извещает о проведении 1 июля 2025 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3–2

**Лот № 1:** капитальное строение с инв. № 311/С–51601 общей площадью 344.0 кв. м, наименование – магазин № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание магазина с надворными постройками: складом, уборной. Капитальное строение с инв. № 311/С–51602 общей площадью 56,0 кв. м, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально–технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание склада.

Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321282808301000125 площадью 0,1576 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, д. Хорошевка, ул. Юбилейная, 1А.

**Начальная цена** продажи без НДС – 22 150,00 бел. руб. **Задаток** – 221,50 бел. руб.

**Лот № 2:** капитальное строение с инв. № 311/С–52024 общей площадью 141,9 кв. м, наименование – магазин № 14, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой и котельной здание магазина. Капитальное строение с инв. № 311/С–52023 общей площадью 17,1 кв. м, наименование – гараж, назначение – здание специализированное транспорта, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание гаража. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды.

Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321284803901000149 площадью 0,0430 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Ленинский с/с, аг. Красный Партизан, ул. Краснопартизанская, 1.

**Начальная цена** продажи без НДС – 10 920,00 бел. руб. **Задаток** – 109,20 бел. руб.

**Лот № 3:** капитальное строение с инв. № 311/С–50662 общей площадью 262,7 кв. м, наименование – магазин № 41, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой здание магазина, с надворными постройками: навесом, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321282804101000786 площадью 0,1050 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, аг. Корма, ул. Комсомольская, 2. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды.

Лот включает оборудование в количестве 12 ед.  Перечень имущества опубликован на сайте: www.deloocenka.by.

**Начальная цена** продажи без НДС – 43 038,00 бел. руб. **Задаток** – 430,38 бел. руб.

**Лот № 4:** капитальное строение с инв. № 311/С–52960 общей площадью 226,7 кв. м, наименование – магазин № 40, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: одноэтажное блочное облицованное кирпичом здание магазина, с надворными постройками: сараем, уборной, забором. Капитальное строение с инв. № 311/С–49825 общей площадью 31,0 кв. м, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально–технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание склада. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды.

Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321282804101000787 площадью 0,0617 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, аг. Корма, ул. Кирова С.М., 120А.

Лот включает оборудование в количестве 8 ед.  Перечень имущества опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Начальная цена** продажи без НДС – 20 690,00 бел. руб. **Задаток** – 206,90 бел. руб.

**Лот № 5:** капитальное строение с инв. № 311/С–50661 общей площадью 216,0 кв. м, наименование – кафе–кулинария, назначение – здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321282804101000454 площадью 0,0659 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, аг. Корма, ул. Комсомольская, 1. Лот включает оборудование в количестве 8 ед. Перечень имущества опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Начальная цена** продажи без НДС – 16 150,00 бел. руб. **Задаток** – 161,50 бел. руб.

**Лот № 6:** капитальное строение с инв. № 311/С–51318 общей площадью 64,6 кв. м, наименование – магазин № 18, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание с надворными постройками: сараем, уборной, двумя крыльцами, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321250100003001592 площадью 0,0316 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Крылова. Лот включает оборудование в количестве 5 ед.  Перечень имущества опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Начальная цена** продажи без НДС – 20 177,00 бел. руб. **Задаток** – 201,77 бел. руб.

**Лот № 7:** капитальное строение общей площадью 124,7 кв. м, наименование – здание магазина, назначение – нет сведений, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321275703601000472 площадью 0,0752 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, г. п. Тереховка, ул. Ленина В. И.

Лот включает оборудование в количестве 12 ед. Перечень имущества опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Начальная цена** продажи без НДС – 33 900,00 бел. руб. **Задаток** – 339,00 бел. руб.

**Лот № 8:** СОТ Кореневка (торговый пав.), инв. № 1355/474, морозильник ММ 163, инв. № 247/3321, холодильник торг., инв. № 1518/492, сигнализация пож., инв. № Хза304, сигнализация охр., инв. № Хза87, ТОРГОВОЕ ОБОР. (прилавок), 2 шт., инв. № Хза89, ТОР. ОБОР. (стеллажи), 3 шт., инв. № 1356/474. Заключен договор аренды от 27.05.2025г. № б/н

**Начальная цена** продажи без НДС – 2 993,00 бел. руб. **Задаток** – 29,93 бел. руб.

Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли–продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона.

**Продавец: Добрушское райПО,** г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47. Конт. тел.: +375 232 34–98–92, +375 44 590–84–01.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3–2, в рабочие дни с 10.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 30.06.2025 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

